ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1981
12
САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 10 (1310)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

## РАШЭННІ XXVI З'ЕЗДА КПСС—У ЖЫЦЦЁ!

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### НА БАЗЕ

матэматычнага факультэта праведзена расшыранае пасяджэнне Мінскага гарадскога навуковага семінара па краявых задачах і асаблівых інтэгральных ураўненнях. Яно прысвячалася 75-годдзю з дня нараджэння вядомага савецкага матэматыка акадэміка АН БССР Ф. Д. Гахава. У рабоце семінара прынялі ўдзел звыш 100 навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў. Сярод іх — 13 іншагародніх удзельнікаў.

Адбылася гутарка ўдзельнікаў семінара з прарэктарам БДУ імя У. І. Леніна па навуковай рабоце І. П. Зяцьковым, у ходзе якой быў закрануты шэраг пытанняў аб развіцці матэматыкі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце і некаторыя іншыя пытанні.

**М. ЛАХВІЧ.**

### НОВАЯ ФОРМА

сувязі вышэйшай школы з сям'ёй нарадзілася на фізічным факультэце універсітэта. Па ініцыятыве дэканата ўпершыню праведзена сустрэча прадстаўнікоў ВНУ з бацькамі першакурснікаў. Яе адкрыў дэкан факультэта Э. М. Шпілеўскі. Пасля ўступнага слова ён адказаў на шматлікія пытанні прысутных.

Зацікавіла гасцей экскурсія па універсітэту і факультэту. Карыснымі для абодвух бакоў былі гутаркі куратараў груп з бацькамі студэнтаў.

**Я. УШАКОЎ,**
**намеснік дэкана фізфака.**

### ЧЛЕНЫ АГІТБРЫГАДЫ

прыёмнай камісіі БДУ імя У. І. Леніна выступілі перад маладымі рабочымі і калгаснікамі, перад вучнямі старэйшых класаў сярэдніх школ Гомельскай і Брэсцкай абласцей. У састаў агітбрыгады ўваходзілі выкладчыкі розных факультэтаў і кафедр. Было прачытана шмат лекцый аб навукова-даследчым, грамадска-палітычным і культурным жыцці універсітэта, правілах прыёму ў БДУ імя У. І. Леніна, у кінатэатрах райцэнтраў дэманстравалася кінастужка «Універсітэт запрашае».

**Г. СМАЛЯКОЎ,**
**кіраўнік агітбрыгады.**

### АДБЫЎСЯ

арганізацыйны пленум камітэта камсамола універсітэта. У сувязі з пераходам на работу ў ЦК ЛКСМБ ад абавязкаў сакратара камітэта камсамола і члена бюро вызвалены П. І. Брыгадзін.

Сакратаром камітэта камсамола выбраны А. М. Рухля, малодшы навуковы супрацоўнік НДІ ФХП.

**В. САБАЛЕЎСКІ.**



**У авангардзе сацыялістычнага спаборніцтва ідуць камуністы Вылічальнага цэнтра старшы інжынер А. П. ПЛАТОНАЎ, загадчык аддзела М. А. КАРАТАЕЎ, старшы навуковы супрацоўнік Л. А. ЗАЛАТАРЭВІЧ.**

**Фота В. ШАЧАКА.**

### СЭРЦАМ УСПРЫНЯЛІ

САВЕЦКІЯ ЛЮДЗІ сэрцам успрынялі гістарычныя рашэнні XXVI з'езда КПСС. Кожнага з нас усхвалявалі пранікнёныя словы таварыша Л. І. Брэжнева, сказаныя ім у Справаздачным дакладзе ЦК КПСС з'езду партыі. Яны — сведчанне міралюбівай знешняй палітыкі нашай партыі, клопатаў аб дабрабыце савецкіх людзей.

Мы, камсамольцы, студэнты БДУ імя У. І. Леніна, павінны выдатнай вучобай, актыўнай грамадскай дзейнасцю ажыццяўляць рашэнні партыйнага форуму, быць надзейнай зменай бацькоў.

**С. БАГДАНОВІЧ,**
**сакратар камітэта камсамола журфака.**

### ШЧЫРА ЎДЗЯЧНЫ

БАРАЦЬБА за мір і раззбраенне—галоўная задача дня. Навукова-тэхнічны прагрэс узняў сучасныя віды зброі на такі ўзровень, што адзін неасцярожны крок можа прывесці свет да катастрофы, да поўнага знішчэння. Таму, як ніколі, своечасовымі сталі словы Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева пра тое, што мір трэба і можна адстаяць.

Замежныя студэнты, уся прагрэсіўная моладзь свету выказваюць сваю ўдзячнасць партыі вялікага Леніна, яе Цэнтральнаму Камітэту за намаганні зберагчы мір для будучых пакаленняў.

**Педра КУБІК,**
**студэнт**
**з Народнай Рэспублікі Конга.**

БЯРЫ З КАМУНІСТАЎ ПРЫКЛАД

## ДАРЫЦЬ СВАЕ ВЕДЫ

ЗАНЯТКІ закончыліся. Імклівым патокам, збягаючы па лесвіцы, студэнты спяшаліся ў гардэроб. Ішлі на свае кафедры выкладчыкі. Бо для іх правядзенне лекцый — толькі частка штодзённай работы.

Кафедра гісторыі філасофіі і логікі. Толькі што адбылося чарговае пасяджэнне кафедры.

Уладзімір Фядотавіч Бяркоў гутарыў з замежным студэнтам, растлумачваў нешта незразумелае. Прафесія ў У. Ф. Бяркова нялёгкая. Ён выкладае логіку. Нядаўна абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Логіка-метадалагічны аналіз навуковай праблемы».

Яшчэ ў школьныя гады вабілі У. Ф. Бяркова гуманітарныя прадметы, асабліва гісторыя. Цікава было займацца ў школьным гуртку. Прага да ведаў прывяла яго з вучнёўскай парты ў вялікія студэнцкія аўдыторыі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Адсюль пачаўся сапраўдны шлях у таямніцы нязведанага.

Юнацкая зацікаўленасць навукай перарасла ў неабходнасць займацца ёю. У студэнцкія гады Уладзімір Фядотавіч падрабязна вывучае творы класікаў марксізму-ленінізму, філасофію, логіку. Многа ўзнікала незразумелых пытанняў, якія ў навуцы яшчэ мала распрацаваны. Хацелася працаваць над усім нязведаным, пісаць, знаходзіць. З цягам часу навуковыя інтарэсы больш канкрэтызаваліся, але пытанні логікі цікавілі асабліва.

Пасля заканчэння універсітэта У. Ф. Бяркоў ідзе на камсамольскую работу. Але ўсё ж жаданне вучыцца не пакідала яго. Уладзімір Фядотавіч упарта рыхтуецца да паступлення ў аспірантуру. Мара здзейснілася. Пачалася карпатлівая работа над кандыдацкай дысертацыяй. Тэма яе вызначалася наступным чынам: «Лагічная сутнасць пытанняў».

Ад вызначанага кірунку навуковай дзейнасці У. Ф. Бяркоў не адступіў і пры напісанні доктарскай. Толькі тэма апошняй больш ускладнілася. Трэба было даць метадалагічны аналіз навуковай праблемы, робячы гэта з пункту гледжання логікі.

— Працаваць давялося вельмі многа,— гаворыць Уладзімір Фядотавіч.— Былі і своеасаблівыя цяжкасці, якія нярэдка заводзілі ў тупік. Тады за дапамогай звяртаўся да літаратуры. Любыя незразумелыя пытанні стараешся ўдакладніць, высветліць — толькі тады праца прыносіць задавальненне.

У сваёй доктарскай дысертацыі У. Ф. Бяркоў здолеў тэарэтычна абгрунтаваць метадалагічны працэс пастаноўкі розных праблем у навуцы.

Навуковая дзейнасць У. Ф. Бяркова цесна звязана з грамадска - палітычнай. І тут яго цікавяць праблемныя пытанні. Ён часта выступае з лекцыямі перад кіраўнікамі прапагандысцкіх гурткоў, перад агітатарамі.

У рэспубліканскай школе лектараў і метадыстаў Уладзімір Фядотавіч нядаўна выступіў з дакладам «Лагічныя асновы праблемнага чытання лекцый». Зараз, калі востра стаіць пытанне праблемнага правядзення лекцыі, ён здолеў распрацаваць тыя формы, якія ўводзяць слухача ў праблемную сітуацыю. Цеснае супрацоўніцтва з Мінскай абласной арганізацыяй таварыства «Веды», дзе У. Ф. Бяркоў з'яўляецца старшынёй навукова-метадычнага савета па тэорыі і методыцы лекцыйнай прапаганды, дае яму магчымасць несці свае веды ў шырокія масы слухачоў.

**А. ВАСІЛЬКЕВІЧ.**

# САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

## БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА НА 1981 ГОД

З пачуццём законнага гонару за нашу Радзіму сустрэў калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта 1981 год— год XXVI з'езда КПСС, год свайго 60-годдзя.

Калектыў універсітэта, як і ўвесь савецкі народ, аднадушна падтрымлівае і адабрае ўнутраную і знешнюю палітыку Камуністычнай партыі. Вучоныя, студэнты і выкладчыкі, рабочыя і служачыя БДУ імя У. І. Леніна ўносяць дастойны ўклад у паспяховае ажыццяўленне планаў партыі. У выніку вялікай арганізатарскай, грамадска-палітычнай работы рэктарата, парткома, мясцкома БДУ імя У. І. Леніна, усяго калектыву універсітэта прынятыя на 1980 год сацыялістычныя абавязацельствы паспяхова выкананы і перавыкананы. Белдзяржуніверсітэт дабіўся значных поспехаў у падрыхтоўцы спецыялістаў для народнай гаспадаркі, расшырыў навуковую дзейнасць, павялічыў укараненне навуковых рэзультатаў у прамысловасць, палепшыў грамадска-палітычную і адміністратыўна-гаспадарчую дзейнасць. Далейшае развіццё атрымала навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва з прадпрыемствамі і навуковымі ўстановамі Беларусі. У адпаведнасці з рашэннямі XXVI з'езда КПСС у цэнтры ўвагі партыйных, дзяржаўных, камсамольскіх і прафсаюзных органаў павінны стаяць пытанні павышэння эфектыўнасці і якасці работы ва ўсіх звеннях народнай гаспадаркі. У сувязі з гэтым калектыў універсітэта лічыць неабходным сканцэнтраваць свае намаганні на наступных асноўных напрамках:

— **павышэнне якасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных, узброеных марксісцка-ленінскім светапоглядам кадраў па спецыяльнасцях, якія садзейнічаюць навукова-тэхнічнаму прагрэсу, умацаванне ўкладу Белдзяржуніверсітэта ва ўдасканаленне вышэйшай адукацыі ў краіне;**

— **забеспячэнне развіцця фундаментальных і прыкладных даследаванняў у галіне грамадскіх і прыродазнаўчых навук;**

— **удасканаленне вучэбна-метадычнай работы, укараненне навуковых прынцыпаў арганізацыі вучэбнага працэсу, выкарыстанне ў ім навейшых дасягненняў і тэхнічных сродкаў навучання;**

— **удасканаленне камуністычнага выхавання студэнтаў, прапаганды ленінскай тэарэтычнай спадчыны.**

Уключаючыся ва Усесаюзнае сацыялістычнае спаборніцтва, калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна прымае на сябе ў 1981 годзе наступныя сацыялістычныя абавязацельствы:

**1. Выканаць план прыёму і план выпуску спецыялістаў па ўсіх формах навучання.**

**2. Абараніць 8 доктарскіх і 73 кандыдацкія дысертацыі.**

**3. Падрыхтаваць да выдання і выдаць не менш 13 вучэбных дапаможнікаў і 120 метадычных распрацовак.**

**4. Падрыхтаваць да выдання і выдаць не менш 35 манаграфій, 1210 артыкулаў, прачытаць не менш 609 дакладаў на навуковых і навукова-метадычных канферэнцыях.**

**5. Абсталяваць 11 аўдыторый тэхнічнымі сродкамі навучання.**

**6. Арганізаваць і правесці 7 міжнародных і ўсесаюзных канферэнцый. Правесці 3 юбілейныя універсітэцкія канферэнцыі, прысвечаныя 60-годдзю Белдзяржуніверсітэта.**

**7. Паставіць не менш 173 новых лабараторных работ.**

**8. Давесці колькасць дыпломных работ, рэкамендаваных да друку ці ўкаранення, да 31 працэнта.**

**9. Падрыхтаваць да друку не менш 170 артыкулаў у сааўтарстве са студэнтамі.**

**10. Прадставіць не менш 350 заяў на вынаходніцтвы.**

**11. Прадставіць на ўсесаюзны і рэспубліканскі конкурсы не менш 250 студэнцкіх работ.**

**12. Прачытаць не менш 7000 лекцый на грамадска-палітычныя і навуковыя тэмы.**

**13. Сфарміраваць зводны студэнцкі будаўнічы атрад колькасцю не менш 2400 чалавек.**

**14. Падрыхтаваць і прачытаць не менш 2300 дакладаў на універсітэцкай навуковай канферэнцыі.**

**15. Правесці не менш 25 паходаў па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа, прыцягнуць да ўдзелу ў іх 500 студэнтаў.**

**16. Падрыхтаваць 5 майстроў спорту СССР, 24 кандыдаты ў майстры, не менш 90 спартсменаў І разраду, 4600 спартсменаў масавых разрадаў.**

**17. Падрыхтаваць не менш 2500 значкістаў ГПА.**

**18. Выканаць наменклатурных мерапрыемстваў па ахове працы на 11 тысяч рублёў.**

*Сацыялістычныя абавязацельствы прыняты на сходзе актыву Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна 2 сакавіка 1981 года.*



**Лабараторыя высокатэмпературных рэакцый лічыцца адной з лепшых у НДІ ФХП.**

**НА ЗДЫМКУ: малодшы навуковы супрацоўнік У. КАРАВАЙ і інжынер Г. ЛЕЎЧЫК праводзяць чарговы дослед.**

**Фота В. ШАЧАКА.**

# ВІНШУЕМ З ПЕРАМОГАЙ!

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за 1980 год пераможцамі прызнаны:

1. **Фізічны факультэт.**
2. **Факультэт радыёфізікі і электронікі.**
3. **Факультэт журналістыкі.**

Сярод агульнауніверсітэцкіх кафедр грамадскіх навук — **кафедра гісторыі філасофіі і логікі.** Сярод агульнауніверсітэцкіх кафедр замежных моў — **кафедра англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў.**

Фізічны факультэт (дэкан дацэнт Э. М. Шпілеўскі, сакратар партбюро дацэнт Н. М. Хаўратовіч, старшыня прафбюро дацэнт М. Н. Полазаў), які заняў І месца, узнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам і Ганаровай граматай рэктарата, парткома і мясцкома.

Факультэт радыёфізікі і электронікі (дэкан прафесар А. М. Шырокаў, сакратар партбюро старшы выкладчык Э. Я. Радоўскі, старшыня прафбюро дацэнт У. І. Мікуловіч), які заняў ІІ месца, узнагароджаны вымпелам і Ганаровай граматай рэктарата, парткома і мясцкома.

Факультэт журналістыкі (дэкан прафесар Р. В. Булацкі, сакратар партбюро дацэнт А. А. Плаўнік, старшыня прафбюро дацэнт Н. Ц. Фральцова), які заняў ІІІ месца, узнагароджаны вымпелам і Ганаровай граматай рэктарата, парткома і мясцкома.

Кафедра гісторыі філасофіі і логікі (загадчык кафедры прафесар А. С. Кляўчэня, прафорг А. А. Лягчылін), якая заняла І месца сярод агульнауніверсітэцкіх кафедр грамадскіх навук, узнагароджана вымпелам і Ганаровай граматай рэктарата, парткома і мясцкома.

Кафедра англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў (загадчыца кафедры дацэнт С. В. Лузгіна, прафорг В. В. Паўлоўская), якая заняла І месца сярод агульнауніверсітэцкіх кафедр замежных моў, узнагароджана вымпелам і Ганаровай граматай рэктарата, парткома і мясцкома.

Сумесным рашэннем калегіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і прэзідыума БРК прафсаюза ўзнагароджаны значком «Ударнік Х пяцігодкі» 31 супрацоўнік універсітэта.

Рашэннем адміністрацыі і мясцкома знакам «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва 1980 года» узнагароджаны 60 супрацоўнікаў; 27 чалавек адзначаны значком «Ударнік камуністычнай працы»; 210 чалавек узнагароджаны ганаровымі граматамі рэктарата, парткома і мясцкома; 171 супрацоўніку аб'яўлена падзяка.

# ЯКІМ БЫЦЬ СПАБОРНІЦТВУ

1980 ГОД быў багаты на знамянальныя даты — 110-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна, 35-годдзе Перамогі над фашысцкай Германіяй; ён быў годам актыўнай работы ўсяго калектыву універсітэта па дастойнай сустрэчы XXVI з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Нарэшце, 1980 год быў завяршаючым годам дзесятай пяцігодкі. І сёння мы з радасцю гаворым, што калектыў Белдзяржуніверсітэта з гонарам справіўся з планавымі заданнямі, сацыялістычнымі абавязацельствамі за пяцігодку і 1980 год.

Ідучы насустрач XXVI з'езду партыі, наш калектыў выступіў у сістэме Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР ініцыятарам сацыялістычнага спаборніцтва пад дэвізам «Пяцігодцы — пераможны фініш! XXVI з'езду КПСС — дастойную сустрэчу!», адобранага калегіяй міністэрства і прэзідыумам Рэспубліканскага камітэта прафсаюза, і прыняў павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы, якія былі таксама з гонарам выкананы і перавыкананы.

Аб гэтым калектыў універсітэта рапартаваў XXIX з'езду КПБ і XXVI з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

У адпаведнасці з існуючым палажэннем агульнауніверсітэцкая камісія па сацыялістычнаму спаборніцтву падвяла яго вынікі па групах вучэбных факультэтаў, агульнауніверсітэцкіх кафедр грамадскіх навук, уключаючы кафедры педагогікі і псіхалогіі, а таксама зацверджаны рэзультаты па агульнафакультэцкіх кафедрах замежных моў. Сёння яны друкуюцца ў газеце.

Спынімся каротка толькі на аналізе некаторых вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва за 1980 год.

У 1980 годзе план выпуску спецыялістаў перавыкананы па ўсіх формах навучання і склаў 105,8 працэнта.

Супрацоўнікамі універсітэта абаронена 6 доктарскіх дысертацый, што ў 3 разы больш, чым у 1979 годзе. У 1980 годзе значна палепшыўся паказчык, які характарызуе работу нашай аспірантуры. Абаронена 70 кандыдацкіх дысертацый (1979 г.— 59), з іх 22 абаронены аспірантамі да заканчэння тэрміну аспірантуры (у 1979 г.— 8). Колькасць паспяхова скончыўшых аспірантуру склала 72,1 працэнта (у 1979 г.— 56,4). Гэтаму садзейнічала тое, што ва універсітэце быў распрацаваны план мерапрыемстваў па ўдасканаленню атэстацыі і комплекснай падрыхтоўцы навуковых і навукова-педагагічных кадраў, які паспяхова выконваецца.

Разам з тым, 22 аспіранты, якія закончылі аспірантуру з абаронай дысертацыі,— гэта толькі адна сёмая частка выпуску аспірантаў 1980 года. На фізічным факультэце ў тэрмін абараніўся толькі кожны трэці аспірант, на факультэце радыёфізікі і электронікі — кожны 6, на філалагічным факультэце з 11 аспірантаў у тэрмін абаранілі дысертацыі толькі двое. Такім чынам, падрыхтоўка выкладчыцкага саставу вышэйшай кваліфікацыі павінна быць у цэнтры ўвагі нашай далейшай работы, адным з галоўных кірункаў арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва.

Цэнтральным звяном сістэмы ўнутрыуніверсітэцкага сацыялістычнага спаборніцтва былі і застаюцца пытанні ўдасканалення вучэбна-метадычнай работы, павышэння эфектыўнасці і якасці падрыхтоўкі спецыялістаў для народнай гаспадаркі. У 1980 годзе навукова-педагагічную работу ва універсітэце вялі 1047 дактароў і кандыдатаў навук (у 1976 — 826), у тым ліку 145 дактароў навук (у 1979 — 114), з іх 43 акадэмікі і члены-карэспандэнты (у 1979— 17).

Удасканаленню навучальнага працэсу садзейнічае ўкараненне прагрэсіўных форм і метадаў навучання з прымяненнем навейшых тэхнічных сродкаў. У 1980 годзе аўдыторны фонд, які аснашчаны ТСН, дасягнуў 29 працэнтаў.

Для 1980 года характэрна і павышэнне ўзроўню навукова-метадычнай работы. На ўсесаюзных і занальных канферэнцыях прачытана 240 навукова-метадычных дакладаў, падрыхтавана 186 метадычных указанняў і распрацовак да вучэбных курсаў. Толькі з грыфам Мінвуза выдадзена 20 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, у тым ліку 2 у цэнтральных выдавецтвах. Прыкладна 25 працэнтаў усіх вывучаемых дысцыплін забяспечаны падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі, выдадзенымі вучонымі універсітэта.

Па раздзелу вучэбна-метадычнай работы ў міжфакультэцкім спаборніцтве першае месца заняў калектыў факультэта радыёфізікі і электронікі.

Якія ж нашы рэзервы павышэння эфектыўнасці вучэбнага працэсу, у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў?

Відаць, адным з асноўных паказчыкаў, які вызначае агульны ўзровень вучэбна-метадычнай работы, з'яўляецца выданне падручнікаў, вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, навукова-метадычных артыкулаў.

Навукова-метадычныя артыкулы ў міжнародных выданнях апублікавалі выкладчыкі толькі трох факультэтаў: фізічнага, факультэта радыёфізікі і электронікі, факультэта прыкладной матэматыкі. У 6 факультэтаў колькасць апублікаваных артыкулаў навукова-метадычнага характару ў рэспубліканскіх выданнях менш у разліку на аднаго выкладчыка, чым у сярэднім па ўсіх факультэтах. На хімічным факультэце не апублікавана ніводнага артыкула.

Такім чынам, рэзервы ў паляпшэнні навукова-метадычнай работы ёсць, і думаецца, што іх дапаможа прывесці ў дзеянне створаны ва універсітэце навукова-метадычны цэнтр.

Калектыў універсітэта ў 1980 годзе дабіўся значных поспехаў у развіцці навукі. Тэматыка навуковых даследаванняў ва універсітэце распрацоўваецца па 27 навуковых напрамках. Па важнейшай тэматыцы выконвалася 89 гасдагаворных і 67 дзяржбюджэтных тэм, гэта значыць 63,3 працэнта ад агульнай колькасці НДР. Звыш 90 працэнтаў работ накіравана на стварэнне аб'ектаў новай тэхнікі і тэхналогіі, 76 працэнтаў работ выконвалася з элементамі новых тэхнічных рашэнняў на ўзроўні вынаходніцтваў. Пададзены 363 заявы на вынаходніцтвы, што складае 128,9 працэнта да ўзроўню 1979 года. На 204 заявы атрыманы станоўчыя рашэнні.

На XXVI з'ездзе КПСС пастаўлена задача яшчэ больш цеснай інтэграцыі навукі з вытворчасцю як настойлівага патрабавання сучаснай эпохі. Базай для больш шырокіх маштабаў прыкладных навуковых распрацовак ва універсітэце павінны стаць фундаментальныя даследаванні праблемных і галіновых навукова-даследчых лабараторый. Многія пытанні яшчэ неабходна вырашаць на факультэтах і ў навукова-даследчых падраздзяленнях па павышэнню эканамічнага эфекту ад вынікаў укаранення навуковых работ.

**Э. ШАСТАКОВІЧ, старшыня мясцкома БДУ.**

# А ШТО ДУМАЕЦЕ ВЫ?

## ЗАДАЧЫ І ПРАБЛЕМЫ СТУДЭНЦКІХ НАВУКОВЫХ ГУРТКОЎ

У ЦЯПЕРАШНІ ЧАС пытанне аб задачах студэнцкіх навуковых гурткоў асабліва важнае. Гэта тлумачыцца тым, што студэнцкія навуковыя гурткі ёсць практычна на ўсіх кафедрах. У іх рабоце ўдзельнічаюць больш чым 70 працэнтаў студэнтаў БДУ.

Зацікаўленасць гэтым пытаннем узрасла пасля арганізацыйнага афармлення СНТ на хімічным і механіка-матэматычным факультэтах і распрацоўкі Статуса СНТ, бо студэнцкі навуковы гурток разам з СНДЛ з'яўляецца пярвічнай арганізацыйнай адзінкай СНТ.

Аднак, як паказалі апытанні, мэты і задачы студэнцкіх навуковых гурткоў не заўсёды ясна разумеюць не толькі члены гэтых гурткоў, але часта і іх старасты і нават супрацоўнікі кафедр.

Студэнцкі навуковы гурток — гэта добраахвотнае аб'яднанне студэнтаў, якія цікавяцца адным і тым жа напрамкам навукі. Навуковыя напрамкі ў нас прадстаўлены кафедрамі, і натуральна, што навуковыя студэнцкія гурткі ствараюцца пры кафедрах.

Асноўная мэта СНТ — прыцягненне студэнтаў да НДР, фарміраванне ў іх творчага падыходу да рашэння навуковых задач і прасцейшых навыкаў грамадскай работы ў калектыве. Для дасягнення пастаўленых мэт работа павінна весціся ў многіх напрамках.

Так, пасяджэнні навуковых студэнцкіх гурткоў могуць быць прысвечаны сустрэчам з вядучымі вучонымі, азнаямленню з сучаснымі метадамі даследаванняў, адбору лепшых работ для ўдзелу ў рэспубліканскім і ўсесаюзным аглядах-конкурсах і ў студэнцкіх навуковых канферэнцыях, прыняццю новых кандыдатаў у члены СНТ, падрыхтоўцы выпускаў «Бюлетэня СНТ» і г. д. Іменна на студэнцкія навуковыя гурткі павінна быць ускладзена задача падрыхтоўкі каманд для ўдзелу ў 1-м і 2-м турах алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс».

Навуковыя студэнцкія гурткі не могуць паспяхова функцыяніраваць без пастаяннай увагі і падтрымкі. Па-першае, неабходна забяспечыць дастаткова сур'ёзныя адносіны да студэнцкіх навуковых гурткоў з боку грамадскіх арганізацый. Па-другое, пажадана, каб работа ў гуртку СНТ улічвалася пры размеркаванні выпускнікоў, што, дарэчы, падразумявае і «Палажэнне аб размеркаванні...».

Пры гэтых умовах, па-майму меркаванню, значна ўзрасце якасць і ўзровень студэнцкіх навуковых даследаванняў. А што думаюць наконт гэтага ўсе зацікаўленыя?

**А. ВЕЧАР,**
**намеснік старшыні навуковага студэнцкага савета універсітэта.**

# НЕКАЛЬКІ СЛОЎ ПРА «СЛОВА»

АГЛЯД ДРУКУ

ЧАЛАВЕК, зацікаўлены старажытнарускай літаратурай, дарэмна будзе шукаць ніжэй поўную назву славутага літаратурнага помніка. Прадмет гутаркі — насценная газета філфака «Слова філолага». І гэтае «Слова»... вартае добрых слоў.

Жыццё факультэта газета адлюстроўвае даволі ўсебакова і робіць гэта на высокім літаратурным узроўні. Рэдакцыя старанна захоўвае і працягвае традыцыі, якія дапамагаюць стварыць выразны «воблік» газеты. Студэнты ўжо прывычна шукаюць у новых нумарах даўно знаёмыя рубрыкі: «Педпрактыка», «Мая група», «Нашы выпускнікі», «Гумар»... Спынімся на найбольш цікавых з іх.

Рэгулярна паяўляецца ў насценцы «Фалькларыст» — дадатак гуртка беларускага фальклору. У ім друкуюцца матэрыялы кіраўнікоў фальклорных практык, студэнцкія дзённікі, уражанні, успаміны, найбольш цікавыя з сабраных фальклорных матэрыялаў, фотаздымкі.

Заўсёды з цікавасцю чытаюцца матэрыялы з рубрыкі «Педпрактыка». Студэнты ахвотна расказваюць аб днях, праведзеных у школах у якасці настаўнікаў, разважаюць аб тым, што атрымалася і не атрымалася, дзеляцца сваім першым настаўніцкім вопытам. І побач друкуюцца, напрыклад, байкі, напісаныя вучнямі пятага класа — выхаванцамі філолагаў-практыкантаў.

З іншых рубрык можна назваць «Ветразь» — старонку з вершамі, прозай студэнтаў (у тым ліку і замежных). Пад рубрыкай «Кінарама» публікуюцца звесткі пра новыя фільмы, а часцей — спрэчкі аб кінастужках. Юбілеям выдатных рускіх, беларускіх, савецкіх і замежных пісьменнікаў прысвечаны «Літаратурны дадатак». Вось, напрыклад, як аформлена старонка да 100-годдзя з дня нараджэння А. А. Блока: вытрымка з «Успамінаў пра А. Блока» А. Ахматавай, скарочаны даклад В. Барадаеўскага (паэта, сучасніка А. Блока) «Вобраз паэта» і 6 вершаў самога Блока. Рэдакцыя імкнецца змяшчаць у «Літаратурным дадатку» даволі рэдкія матэрыялы, дакументы. Газета шукае і новыя тэмы, новыя формы. У лістападаўскім нумары «Слова філолага» паявіўся, напрыклад, агляд вераснёўскіх нумароў часопісаў для моладзі.

Першыя два аркушы газеты адведзены матэрыялам партбюро і камітэта камсамола. І вось тут хочацца зрабіць некалькі заўваг. У адным з нумароў змешчана заметка «ІХ Усесаюзны» (аб Усесаюзным злёце пераможцаў паходу па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа). У матэрыяле няма ніводнага слова пра ўдзел ва Усесаюзным паходзе студэнтаў БДУ (не гаворачы ўжо пра студэнтаў філфака). Чытаем: «Некалькі гадоў назад у нашай рэспубліцы пачалася аперацыя «Летапіс народнай славы», якая стала састаўной часткай Усесаюзнага паходу моладзі». Вось тут бы і сказаць, якія радкі ўпісалі ў «Летапіс» самі філолагі, або, наадварот, забіць трывогу, калі факультэт знаходзіцца ў баку ад важнай і карыснай справы. Аўтар гэтага не зрабіў і абмежаваўся агульнымі словамі.

Дарэчы, чаму пад заметкай «ІХ Усесаюзны» няма прозвішча аўтара? І гэта не адзіны непадпісаны матэрыял у «Слове філолага». Калі заметку «Канстытуцыя жыве і дзейнічае» яшчэ можна палічыць за перадавы артыкул, то зусім незразумела, чаму застаўся ананімным надрукаваны ў «Літаратурным дадатку» матэрыял аб творчасці А. Грына «Тварыць мару». Няхай прабачыць мне аўтар, але адсутнасць подпісу стварае ўражанне, што гэты матэрыял быў акуратна перапісаны з нейкай газеты ці часопіса.

Сваю насценку на філфаку любяць. Яе зачытваюць да дзірак. Дзіркі застаюцца на месцы найбольш цікавых фотаздымкаў. А іншым часам таямніча знікаюць нават цэлыя газетныя аркушы (кожны нумар складаецца з сямі — дзевяці асобных аркушаў). Думаецца, найбольш надзейны спосаб абараніць газету ад такіх чытачоў — зрабіць зашклёную вітрыну.

Хацелася б пажадаць рэдакцыі «Слова філолага» рабіць больш баявымі, дыскусійнымі матэрыялы аб камсамольскім жыцці факультэта. Можна правесці дыскусію, напрыклад, аб праблемах выкарыстання вольнага часу студэнтамі. Можна ўвесці рубрыку «Тваё камсамольскае даручэнне» і запрасіць да размовы не выдатніка, не лепшага студэнта, а аднаго з «пасіўных». І чаму, калі стаіць рубрыка «Мая група», то гэта, як правіла, расказ аб адной з лепшых груп?

А закончыць хочацца словамі з заметкі «Па скарбы», напісанай старастам фальклорнага гуртка Г. Паўловічам. Словы гэтыя, шчырыя і паэтычныя, можна, пэўна, аднесці не толькі да першакурснікаў філфака і да іх фальклорнай практыкі, а да кожнага, хто займаецца і будзе займацца сур'ёзнай і адказнай справай. Такая справа ёсць у тых, хто робіць «Слова філолага» — у Андрэя Петрашкевіча (рэдактар), Таццяны Анчук (адказная за мастацкае афармленне), Святланы Плаўнік, Марыны Кроль і многіх іншых. У кожнага з нас ёсць цяпер і будзе заўтра такая справа. Вось гэтыя словы: «Але практыка — гэта праца. І таму добра было б, каб ужо сёння першакурснікі, усе, каго чакае гэтая праца, рыхтаваліся да яе».

**В. ЕФІМЕНКА,**
**студэнтка журфака.**

# ЛЕТАПІС БДУ

**(Пачатак у № 4, 6, 7, 8).**

**1935-36 навучальны год**

Раздзелена кафедра марксізму-ленінізму на 4 кафедры: ленінізму, гісторыі ВКП(б), дыялектычнага матэрыялізму, палітычнай эканоміі.

**1937 год**
**Студзень**

Аб'яднанне кафедр ленінізму, гісторыі ВКП(б) і дыялектычнага матэрыялізму.

Ва універсітэце 23 кафедры. На хімфаку: арганічнай, аналітычнай, фізічнай, неарганічнай хіміі.

На біяфаку: фізіялогіі раслін, сістэматыкі раслін, заалогіі пазваночных, фізіялогіі і анатоміі чалавека.

На гістфаку: гісторыі СССР і БССР, новай гісторыі, гісторыі сярэдніх вякоў і старажытнага свету, дыялектычнага матэрыялізму і ленінізму.

На геафаку: глебазнаўства, агульнай геалогіі, мінералогіі і картаграфіі, фізічнай геаграфіі.

На фізмаце: матэматыкі, механікі, фізікі.

Агульнауніверсітэцкія кафедры: замежных моў, фізкультуры і спорту.

**1 сакавіка**

Ва універсітэце 925 студэнтаў (хімфак — 187, біяфак — 178, фізфак — 259, гістфак — 140, геафак — 161).

**1936-37 навучальны год**

У 1936-37 навучальным годзе выдадзены 3 агульнауніверсітэцкія зборнікі навуковых работ, абаранілі кандыдацкія дысертацыі 4 супрацоўнікі універсітэта.

**1938 год**
**10 красавіка**

Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб увядзенні ва ўсіх ВНУ краіны з 1 верасня чатырохбальнай сістэмы: «выдатна», «добра», «пасрэдна», «нездавальняюча».

**1939 год**
**1—3 студзеня**

Універсітэт наведалі дэлегацыі дзевяці рэспублік СССР, якія прыехалі на святкаванне 20-годдзя БССР.

**Ліпень**

Адкрыты філалагічны факультэт з аддзяленнямі рускай і беларускай моў і літаратуры. Прымаюцца 50 студэнтаў.

**Верасень**

Былому студэнту БДУ Я. В. Смушкевічу прысвоена званне двойчы Героя Савецкага Саюза.

**1938-39 навучальны год**

Пачалося чытанне лекцый па асновах марксізму-ленінізму на ўсіх факультэтах і курсах.

У адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выхадам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» створана кафедра марксізму-ленінізму, куды ўвайшлі выкладчыкі ленінізму, гісторыі ВКП(б) і філасофіі.

За 1938-39 навучальны год у абарончых гуртках універсітэта падрыхтавана 800 варашылаўскіх стралкоў, 1539 значкістаў СПХА, 130 матацыклістаў, 170 шафёраў, вялікая колькасць парашутыстаў.

**(Працяг будзе).**





**Вялікую ролю ў падрыхтоўцы маладых спецыялістаў адыгрывае глыбокае вывучэнне марксісцка-ленінскай філасофіі. Цікава і з карысцю праходзяць заняткі па філасофіі, якія праводзіць Герой Савецкага Саюза Мікалай Якаўлевіч Зайцаў.**

**Фота В. ШАЧАКА.**



Заняткі спортам дапамагаюць студэнту журфака А. ВЕРУШУ паспяхова вучыцца.

Фота М. ДУБОВІКА.

ПЛАВАННЕ

# ЗАЛОГ ПОСПЕХУ

ТРЫ ДНІ ў басейне інстытута фізічнай культуры 15 зборных каманд ВНУ спрачаліся за званне мацнейшай студэнцкай каманды Белсавета «Буравеснік».

Пасля першага дня спаборніцтваў стала вядома, што гаспадары басейна не збіраюцца ўступаць трывалых пазіцый, якія яны займаюць на працягу апошніх гадоў. Але калі пытанне аб першым месцы было вырашана, то за прызавыя месцы вялі барацьбу каманды плыўцоў Белдзяржуніверсітэта, радыётэхнічнага інстытута і Гомельскага універсітэта.

Кожны з гэтых калектываў у сваім саставе мае лідэра, здольнага павесці за сабой астатнюю каманду. У нашым калектыве такім лідэрам з'яўляецца кандыдат у зборную каманду БССР, майстар спорту СССР Эла Яўсюк, якая на гэтых спаборніцтвах тройчы перамагала. Трэніруюць юную спартсменку А. В. Якімаў, М. І. Карнеева, А. А. Каваленка.

Паспяховае выступленне Э. Яўсюк падтрымалі яе таварышы па камандзе Т. Бягун, М. Сысой, А. Варацінская, М. Жаркоў (усе яны — члены спартыўнага клуба БДУ), а таксама студэнты універсітэта С. Грышаль — IV курс мехмата, І. Камлюк — IV курс біяфака, С. Громаў — І курс журфака, С. Ярмаловіч — ІІ курс фізфака.

Набраўшы 662,5 ачка, зборная каманда нашага універсітэта на гэтых спаборніцтвах заняла другое месца. Каманда Гомельскага універсітэта — на трэцім.

Выступленне зборнай БДУ па плаванню ў зімовым першынстве можна прызнаць паспяховым. Аднак, аналізуючы рэзультаты спартсменаў, хацелася б адзначыць недастаткова высокі ўзровень іх майстэрства. За выключэннем Э. Яўсюк ніхто з нашых спартсменаў не паказаў стабільных рэзультатаў.

З кожным годам барацьба за прызавыя месцы сярод спартсменаў набывае ўсё больш бескампрамісны характар. Толькі рэзультаты на ўзроўні нарматываў «кандыдата ў майстры спорту» і «майстра спорту» дазваляюць спартсменам разлічваць на перамогу на асобных дыстанцыях. А такія рэзультаты могуць паказаць спартсмены, якія трэніруюцца як мінімум 10—11 разоў у тыдзень з вялікай інтэнсіўнасцю заняткаў.

**М. КУЗЬМЯНКОЎ,**
**старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**

ФЕЛЬЕТОН

# «СЛОН У...ДАМКАХ»

ЗДАРЫЛАСЯ гэта ў канцы лістапада мінулага года. Неяк у адну ноч хімфак напаткала бяда. Амаль усе студэнты, члены мужчынскай зборнай каманды па шашках, раптоўна захварэлі на жывот. Ці то хлопцы з'елі чаго-небудзь лішняга, ці то выпілі чагосьці хімічна шкоднага — ніхто не ведае. Аднак факт застаўся фактам: далей сваіх родных пакояў для іх дарогі не было.

Аўтарытэтная камісія, якую ўзначаліў лідэр каманды, кандыдат у майстры спорту Мікалай Георгіевіч Рафальскі, прыйшла да несуцяшальнага вываду:

— Гуляць не змогуць на працягу ўсіх спаборніцтваў.

— Што ж рабіць?—у роспачы прамовіў запасны ігрок Я. М. Рахманько.

Мікалай Георгіевіч не адказаў. Ён доўга моршчыў лоб, правая рука сутаргава сціскала левую, і вось нарэшце на яго твары заззяла шчаслівая ўсмешка:

— А ведаеш, таварыш Рахманько, мы забыліся пра адну важную акалічнасць.

— Якую?

— А тую, што я галоўны суддзя шашачнага турніра.

— Ну і што? — не зразумеў Рахманько.

— Як, што!—здзівіўся галоўны суддзя.— З сённяшняга дня ты не запасны ігрок, а капітан каманды. Акрамя цябе, мы туды ўвядзём супрацоўнікаў Ягорава, Лушчыка і аспіранта Цыганова. Ну, сям-там пагуляе студэнт Анішчук.

— Усё гэта добра,— пачухаў патыліцу новаспечаны капітан,— але існуе палажэнне, якое падпісаў рэктар за № 694-К. Там ясна сказана, што ў студэнцкай камандзе павінна быць не больш як 25 працэнтаў супрацоўнікаў ці выкладчыкаў. У нашым выпадку — толькі двое, а вы хочаце цэлых пяць. Змяняць загад рэктара ніхто не мае права.

— А я і не думаю яго змяняць, а толькі крышачку дапоўню, ну, адным-двума пункцікамі,— знайшоўся Мікалай Георгіевіч.

— Але што ж іншыя факультэты скажуць? — не здаваўся капітан.

— Не хвалюйся, фізікам усё роўна. Яны і так першае месца зоймуць, а шашысты ФПМ самі не супраць узмацніць сваю каманду парачкай майстроў. А астатнія... Некаторыя не зразумеюць сэнсу новага пункта, а калі хто і пакрычыць, то гэта ненадоўга. А мы тым часам у прызёры...

Усё так і атрымалася, як прадказаў Мікалай Георгіевіч. «Дырэктыва Рафальскага» прайшла без асаблівых цяжкасцей. Даслоўна: «Ігрок асноўнага саставу, які адсутнічае на чарговым туры, можа быць заменены любым іграком запаснога саставу, студэнтам або супрацоўнікам». Члены судзейскай калегіі — старшыня спортклуба юрфака У. Лукашэвіч і капітан каманды філфака А. Якавін сцвярджаюць, што гэты пункт нават не выносіўся на галасаванне. Пазней у пратаколе пасяджэння, куды было занесена дапаўненне, ніякіх подпісаў, акрамя аўтографа галоўнага суддзі, знайсці не ўдалося. Пытанне з 25 працэнтамі М. Г. Рафальскі вырашыў таксама хутка. Ён уключыў у спіс каманды 24 чалавекі, з іх 6 супрацоўнікаў. Усё сышлося цюцелька ў цюцельку. І пайшлі крушыць хімікі. З юрфакам 5 : 2, журфакам 6,5 : 0,5, мехматам 4,5 : 2,5. Вось толькі з фізікамі і ФПМ ім не пашанцавала. У час турніра ў адрас каманды хімікаў было пададзена тры пратэсты. Але яны не былі разгледжаны своечасова, бо папалі ў рукі... М. Г. Рафальскага.

«Хай тая курачка здохне, якая ад сябе грабе»,— напэўна, думаў галоўны суддзя, адкладваючы разгляд пратэстаў.

Гледзячы на хімікаў, каманда ФПМ у пяці турах таксама ўключыла ў свой састаў трох выкладчыкаў, майстроў і кандыдатаў у майстры спорту. Менавіта гэтыя дзве каманды і ўвайшлі ў тройку прызёраў. Астатнія факультэты былі прадстаўлены толькі студэнтамі, большасць якіх не мае наогул разрадаў. Больш за ўсіх ад такой палітыкі пацярпелі студэнты мехмата. А. Акулка, капітан каманды мехмата, гаворыць:

— Мы маглі б заняць прызавое месца, калі б супраць нас хімфак не выставіў 5 супрацоўнікаў. Пасля заканчэння турніра камісія на чале з загадчыкам кафедры фізічнага выхавання і спорту ўсё ж разгледзела пратэсты. Аднак ні адзін з іх не быў задаволены (?!)

Дык давайце, таварышы, не будзем здзіўляцца, калі кожны год дзве-тры каманды адмаўляюцца завяршаць шашачны турнір.

І яшчэ адна дзіўная рэч. Афармляючы пратакол першынства, М. Г. Рафальскі ў графе «Недахопы спаборніцтваў» напісаў: «Пажадана ці абмежаваць колькасць запасных, ці дазволіць усім супрацоўнікам удзельнічаць у турніры». І тут жа прапанова: «У будучым годзе дазволіць усім супрацоўнікам прымаць удзел у спаборніцтвах». Апошняя яскрава сведчыць аб тым, што галоўны суддзя добра разумеў палажэнне, зацверджанае рэктарам, і тым не менш пайшоў на яго парушэнне. Дзе ж логіка, паважаны Мікалай Георгіевіч? Цікава, а чаму не былі ўказаны такія хібы: аўдыторыя, дзе праводзіўся турнір, была цеснай, і некаторым удзельнікам прыходзілася гуляць стоячы; не хапала гадзіннікаў (амаль усе гадзіннікі, якія ёсць на кафедры фізвыхавання, могуць служыць толькі ў якасці металалому); не хапала шашак. У апошнім туры многія гулялі... шахматнымі фігурамі. Адзін з ігракоў так і сказаў: «Лічыце майго слана... дамкай».

Ну як тут не ўспомніць персанажа байкі Крылова і яго словы «слана то я і не заўважыў». На жаль, не заўважылі і вы яго, Мікалай Георгіевіч.

Былі і прапановы. Ужо трэці год прапануюць У. Лукашэвіч, П. Цунік, А. Акулка і многія іншыя правесці класіфікацыйны турнір з удзелам выкладчыкаў і студэнтаў, аднак галоўны суддзя толькі абяцае, а тым часам «безразраднікі» гуляюць супраць майстроў спорту. Дарэчы, і ў гэтым турніры разрады прысвоены не былі.

Будзем спадзявацца, што арганізацыйны камітэт, які ажыццяўляе агульнае кіраўніцтва спартакіядай, усё ж заўважыць таго «слана», які стаў перашкодай на шляху папулярызацыі і развіцця шашак сярод студэнтаў універсітэта, і зробіць належны вывад.

**У. КАПСКІ,**
**наш спец. кар.**



# УМАЦОЎВАЦЬ СЯБРОЎСТВА

МІНСКАЕ зямляцтва сальвадорскіх студэнтаў аб'ядноўвае маіх землякоў, што займаюцца ў БПІ, медыцынскім інстытуце, універсітэце і розных тэхнікумах. І хаця наша зямляцтва невялікае па колькасці членаў, яно вядзе значную арганізацыйную і палітычную работу, маштабы якой павялічваюцца з кожным днём.

Зямляцтва сальвадорцаў аб'ядноўваецца пад эгідай асацыяцыі студэнтаў Сальвадора. Гэта дапамагае нам вырашаць такія праблемы, якія мы не можам вырашыць самі. Мы збіраемся разам адзін раз у месяц і абмяркоўваем галоўныя пытанні і задачы, якія ўзнікаюць на працягу месяца, плануем работу.

Наша зямляцтва праводзіла сустрэчы са студэнтамі Эквадора, Грэцыі і Нікарагуа, мы ўдзельнічалі ў суботніках. Нашы студэнты штодзённа назіраюць савецкі лад жыцця, знаёмяцца з савецкімі людзьмі. Гэтыя зносіны дапамагаюць нам зразумець і адчуць, што такое сацыялізм на практыцы.

Нядаўна у кінатэатры «Кастрычнік» адбыўся мітынг салідарнасці з народамі свету, якія змагаюцца за мір, арганізаваны савецкай моладдзю. Нам вельмі прыемна было прысутнічаць на гэтым мітынгу.

Зараз наш народ змагаецца за сваю свабоду. Для нас асабліва важныя цяпер міжнародная падтрымка і салідарнасць. І мы яшчэ раз пераканаліся ў тым, што савецкі народ — надзейны сябар Сальвадора.

Наша зямляцтва неаднаразова звярталася з рознымі пытаннямі ў савецкія грамадскія арганізацыі. Мы ўсюды знаходзім узаемаразуменне, поўную падтрымку і дапамогу. Зараз мы збіраемся арганізаваць фестываль лацінаамерыканскай палітычнай песні, а 28 сакавіка будзем святкаваць 51-ю гадавіну заснавання Камуністычнай партыі Сальвадора. Прыйдзецца шмат папрацаваць, але цяжкасці не палохаюць. У нашым зямляцтве аптымістычна ставяцца да іх. Дзейнасць нашага зямляцтва накіравана на тое, каб умацоўваць пралетарскі інтэрнацыяналізм і дружбу паміж народамі.

**Хайме ВІЛЬЯКОРТА,**
**студэнт III курса журфака.**

# Агляд—увесь год

**Сакратарыят ВЦСПС і Калегія МУС СССР прынялі пастанову аб правядзенні Усесаюзнага агляду бяспекі руху, які будзе праходзіць на працягу ўсяго 1981 года. Асноўнымі задачамі гэтага мерапрыемства з'яўляюцца: далейшая актывізацыя работы гаспадарчых і прафсаюзных органаў па забеспячэнню бяспекі руху, шырокае прыцягненне грамадскасці да работы па папярэджанню дарожна-транспартных здарэнняў, удасканаленне сістэмы забеспячэння бяспекі руху, паляпшэнне работы ў працоўных і вучэбных калектывах па выхаванню дарожнай дысцыпліны ў пешаходаў і вадзіцеляў, узмацненне прапаганды правілаў дарожнага руху сярод насельніцтва.**

**Сёння статыстыка фіксуе некаторае памяншэнне выпадкаў, аднак яны складаюць яшчэ значную колькасць. У год агляду мы, работнікі ДАІ, будзем часцей напамінаць грамадзянам аб неабходнасці дасканалага выканання правілаў дарожнай бяспекі, расказваць аб сумных выніках, да якіх прыводзіць іх ігнараванне.**

**Р. АЎРАМЕНКА,**
**старшы інспектар ДАІ г. Мінска.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

12 сакавіка 1981 г.

Заказ № 436. АТ 02144

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ